Разгледзеўшы хадайніцтвы працоўных калектываў і структурных падраздзяленняў Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта аб заахвочванні працоўных калектываў, перадавікоў народнай гаспадаркі Ашмянскага раёна за найлепшыя дасягненні ў гаспадарчым, сацыяльна-культурным будаўніцтве, грамадска-палітычным жыцці па выніках 2014 года і на падставе Палажэння аб парадку занясення на раённую дошку Гонару лепшых працоўных калектываў, перадавікоў народнай гаспадаркі, лепшай сям'і, зацверджанага рашэннем Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта ад 25 сакавіка 2004 г. № 173 са змяненнямі, унесенымі рашэннем Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта ад 25 лютага 2005 г. № 78, Ашмянскі раённы выканаўчы камітэт ВЫРАШЫЎ:

1. Занесці на раённую дошку Гонару:

1.1. працоўныя калектывы:

аддзела паставак Ашмянскага адкрытага акцыянернага таварыства "Аграпрамтэхніка" (начальнік Антановіч Святаслаў Аляксеевіч);

акушэрска-гінекалагічнай службы ўстановы аховы здароўя "Ашмянская цэнтральная раённая бальніца" (пазаштатны раённы ўрач-акушэр-гінеколаг Кунц Наталля Вітальеўна);

брыгады лівернага аддзялення каўбаснага цэха адкрытага акцыянернага таварыства "Ашмянскі мясакамбінат" (майстар каўбаснага цэха Міжыгурская Валянціна Анатолеўна);

дзяржаўнай установы адукацыі "Яслі-сад в. Гальшаны" (загадчык Каваліцкая Ганна Міхайлаўна);

народнага тэатра гульні і забаў "Серпанцін" (рэжысёр Чыркова Вольга Уладзіміраўна);

сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва "Гальшанскі" (старшыня Праўко Мікалай Мікалаевіч);

службы рэлейнай абароны і аўтаматыкі філіяла Гродзенскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі "Гроднаэнерга" – Ашмянскія электрычныя сеткі (начальнік Корзан Уладзімір Сцяпанавіч);

фермы па вырошчванні і адкорму маладняка буйной рагатай жывёлы "Клявіца" сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва "Граўжышкі" (загадчык Буткевіч Віктар Аляксандравіч);

участка агульнабудаўнічых работ адкрытага акцыянернага таварыства "Будаўнік" (начальнік Пачкоўскі Аляксандр Вікенцевіч);

участка саначысткі і добраўпарадкавання Ашмянскага раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі (начальнік Клушэўскі Аляксандр Іванавіч);

1.2. перадавікоў народнай гаспадаркі:

Багдановіча Віктара Іванавіча, слесара-інструментальшчыка ўчастка пластмас адкрытага акцыянернага таварыства “Радыётэхніка”;

Буткевіча Станіслава Феліксавіча, вадзіцеля аўтамабіля адкрытага акцыянернага таварыства “Ашмянскі мясакамбінат”;

Былінскага Генаддзя Іосіфавіча, начальніка крымінальна-выканаўчай інспекцыі міліцыі грамадскай бяспекі аддзела ўнутраных спраў Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта (далей – Ашмянскі райвыканкам);

Буйніцкую Ірыну Станіславаўну, дырэктара дзяржаўнай установы адукацыі “Ашмянскі цэнтр творчасці дзяцей і моладзі”;

Вайшнаровіч Яніну Францаўну, выкладчыка спецыяльных дысцыплін установы адукацыі “Ашмянскі дзяржаўны прафесійны аграрна-тэхнічны каледж”;

Волк Уладзіміра Зыгмунтавіча, вадзіцеля грузавога аўтамабіля Ашмянскага адкрытага акцыянернага таварыства “Аграпрамтэхніка”;

Галамбоўскага Франца Іванавіча, вадзіцеля аўтамабіля філіяла адкрытага акцыянернага таварыства “Дражджавы камбінат” Ашмянскага дражджавога завода;

Гіля Івана Станіслававіча, майстра ўчастка па вытворчасці сыра на аўтаматызаванай лініі “Ашмянскі сыраробны завод” філіяла адкрытага акцыянернага таварыства “Лідскі малочна-кансервавы камбінат”;

Глускага Валер’яна Іванавіча, старшыню пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі, урача-эндаскапіста ўстановы аховы здароўя “Ашмянская цэнтральная раённая бальніца”;

Загорскага Альберта Вацлававіча, аператара па вырошчванні маладняка буйнай рагатай жывёлы фермы “Семернікі” сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва “Гальшанскі”;

Ігнаценку Алега Алегавіча, машыніста ўкладчыка асфальтабетона дарожна-будаўнічага ўпраўлення № 28 адкрытага акцыянернага таварыства “Дарожна-будаўнічы трэст № 6”;

Казлоўскага Антона Уладзіслававіча, вадзіцеля аўтамабіля сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва “Кракоўка”;

Каспяровіч Наталлю Канстанцінаўну, настаўніка дзяржаўнай установы адукацыі “Гальшанская дзіцячая школа мастацтваў”;

Пазнанскага Сяргея Францавіча, электраманцёра па эксплуатацыі размеркавальных сетак філіяла Гродзенскага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства электраэнергетыкі “Гроднаэнерга” – Ашмянскія электрычныя сеткі;

Пясецкую Алёну Іванаўну, прадаўца Ашмянскага філіяла Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства;

Ракаловіча Віктара Паўлавіча, цесляра ўчастка агульнабудаўнічых работ адкрытага акцыянернага таварыства “Будаўнік”;

Скаскевіча Віктара Аляксандравіча, дырэктара філіяла “Аўтамабільны парк № 13 г. Ашмяны” адкрытага акцыянернага таварыства “Гроднааблаўтатранс”;

Ставарука Генадзія Антонавіча, аператара па штучнаму асемяненню буйной рагатай жывёлы Ашмянскага раённага ўнітарнага прадпрыемства “Селякцыйна-племянны цэнтр жывёлагадоўлі”;

Сярпейку Фёдара Іванавіча, майстра па рамонце тэхналагічнага абсталявання адкрытага акцыянернага таварыства “Ашмяны-Лён”;

Шлемпу Івана Іосіфавіча, трактарыста-машыніста сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва “Крэйванцаўскі”;

Чаплінскую Марыю Сцяпанаўну, загадчыка малочнатаварнай фермы “Вайшнарышкі” сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва “Граўжышкі”;

Янкоўскага Станіслава Іосіфавіча, трактарыста даччынага ўнітарнага Ашмянскага прадпрыемства меліярацыйных сістэм;

Янушкевіча Івана Іосіфавіча, майстра смены брыкетнага цэха адкрытага акцыянернага таварыства “Торфабрыкетны завод Ашмянскі”;

Ясевіча Валерыя Казіміравіча, слесара-рамонтніка ўчастка водаправода і каналізацыі Ашмянскага раённага ўнітарнага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі;

1.3. сям’ю Плявака Алы Леанідаўны і Аляксандра Анатольевіча, якая пражывае ў горадзе Ашмяны, вуліца Усходняя, дом 17, кватэра 8.

2. Аддзелу ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ашмянскага раённага выканаўчага камітэта арганізаваць:

2.1. уручэнне дыпломаў Ашмянскага райвыканкама працоўным калектывам, перадавікам вытворчасці, адукацыі, культуры, аховы здароўя і сферы паслуг, сям’і, якія занесены на раённую дошку Гонару;

2.2. сумесна з аддзелам архітэктуры і будаўніцтва Ашмянскага райвыканкама арганізаваць фатаграфаванне перадавікоў народнай гаспадаркі, сям’і, якія занесены на раённую дошку Гонару, і забяспечыць яе эстэтычнае афармленне да 30 красавіка 2015 г.

3. Сектару бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці кіравання справамі Ашмянскага райвыканкама выплаціць аднаразовае ўзнагароджанне перадавікам народнай гаспадаркі і лепшай сямі, якія занесены на раённую дошку Гонару, у памеры двух базавых велічынь кожнаму.

4. Установе “Рэдакцыя газеты “Ашмянскі веснік” прадоўжыць у газеце рубрыку “Яны занесены на раённую дошку Гонару”, у якой расказваць аб лепшых працоўных калектывах і людзях, удастоеных гэтай пашаны.